А.П.Грыцкевіч,
прафесар Беларускага універсітэта культуры

# АРГАНІЗАЦЫЯ КІРАЎНІЦТВА І КАНТРОЛЮ ЗА ВЫТВОРЧАЙ І ВУЧЭБНАЙ ПРАКТЫКАЙ НА КАФЕДРЫ ГІСТОРЫІ І МУЗЕЯЗНАЎСТВА

Агульнавядомым з'яўляецца палажэнне аб практыцы як састаўной частцы прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Для кафедраў сацыяльна-гуманітарнага профілю арганізацыя азнаямляльнай, вытворчай і вучэбнай практыкі ўваходзіць у патрабаванні да павышэння агульнага ўзроўню навучання студэнтаў і цесна звязана з сістэмай стандартаў у вышэйшый адукацыі.

Кафедра гісторыі і музеязнаўства з'яўляецца выпускаючай для спецыялізацыі "музеязнаўства і ахова помнікаў гісторыі і культуры". Таму практыка студэнтаў гэтай спецыялізацыі ўваходзіць у вучэбныя планы ад І курса (азнаямляльная) да старэйшых курсаў (вучэбная і вытворчая). На кафедры ўстанавілася сістэма арганізацыі студэнцкай практыкі на працягу навучальнага года. Пытанні студэнцкай практыкі разглядаюцца рэгулярна на пасяджэннях кафедры. Прызначаны адказны за правядзенне практыкі (дацэнт А.А.Трусаў). Студэнты асобных курсаў праводзяць практыку пад кіраўніцтвам ст. выкладчыкаў І.Н.Колабавай і А.А.Гулак, выкладчыка Т.Д.Яцкевіч, дацэнта А.А.Трусава. Агульнае кіраўніцтва практыкай выконвае загадчык кафедры гісторыі і музеязнаўства А.П.Грыцкевіч. Для вядзення практыкі на базах дадаткова запрашаюцца спецыялісты-практыкі з музеяў краіны.

Базамі практыкі для спецыялізацыі кафедры з'яўляюцца ў Мінску Нацыянальны музей гісторыі і культуры, Нацыянальны мастацкі музей, Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, Аб'яднанне дзяржаўных літаратурных музеяў Беларусі, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа і іншыя, а таксама музеі Брэста,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гродна, Маладзечна, Навагрудка, Міра, Ліды, Івянца і Заслаўя.

Задачай кіраўнікоў практыкі з'яўляецца арганізацыя самастойнай дзейнасці студэнтаў па засвойванні навыкаў працы ў музеях з неабходнай для гэтага руціннай работай (каталог, картатэка, нумарацыя экспанатаў і інш.).

Усё гэта дае магчымасць выявіць інтарэс і здольнасці, накіраваць дзейнасць студэнтаў у прафесійным накірунку, у тым ліку пошуку элементаў навукова-даследчай работы.

Прыкладам такой творчай працы з'яўляецца арганізацыя сіламі студэнтаў музея Беларускага універсітэта культуры, адкрытага вясной 1999 г. Студэнты II—V курсаў арганізавалі асобныя аддзелы музея (у мініяцюры). Сабралі, у тым ліку сярод выкладчыкаў, экспанаты, размясцілі іх, далі навукова-музейнае апісанне экспазіцыі і з'яўляліся экскурсаводамі. Першая экскурсія была зроблена для кіраўніцтва універсітэта культуры і выкладчыкаў.

Далейшыя шляхі ў арганізацыі студэнцкай практыкі — гэта ўсталяванне сувязей з музейнымі ўстановамі краіны, удасканаленне формаў кантролю і самастойныя публікацыі студэнтаў у прэсе, спецыяльных бюлетэнях і часопісах.

**Л.И.Гузикова,**
**зав. практикой**
**Могилевского библиотечного техникума**

## ПРАКТИКА КАК ФОРМА ЗАКРЕПЛЕНИЯ ЗНАНИЙ, НАВЫКОВ И УМЕНИЙ

Практическое обучение в Могилевском библиотечном техникуме тесно увязывается со всем учебно-воспитательным процессом. Это проявляется в единстве задач, требований, принципов, на которых базируется и учебная, и практическая деятельность. Исходя из главной цели учебно-педагогической деятельности — готовить личность конкурент-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ